1. Золотые правила народной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 223 с.

2. Летнія святы : у 1 кн. Кн. 1 / АксанаКатовіч, Янка Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 291-293с. – Беларускі народны каляндар.

3. Зімовыя святы /АксанаКатовіч, Янка Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2004. – 42с.

**Казачкова В.А., Нікіфарава В.В.** студ. 212 гр.
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## ФАРМІРАВАННЕ ЦІКАВАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА МАСТАЦТВА Ў ПРАЦЭСЕ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Ва ўмовах павелічэння навукаёмістасці вучэбных праграм у малодшай школе і памяншэння колькасці мастацкаарыентаванага кампанента ў складзе уроках ўскладняецца працэс фарміравання цікавасці малодшых школьнікаў да мастацтва. Разам з тым, згодна з «Інструктыўна-метадычным пісьмом «Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі ў 2016/2017 навучальным годзе: актуальныя змястоўныя і арганізацыйныя аспекты», задача ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў 2016/2017 навучальным годзе – працягваць работу па стварэнні рэгіянальных мадэляў выхаваўчай работы ў суботні дзень, дзе ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі выступяць каардынатарамі арганізацыі шостага школьнага дня. Педагагічным калектывам устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі неабходна арыентавацца на правядзенне сумесных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерапрыемстваў для дзяцей і іх бацькоў; выкарыстаць патэнцыял культурна-дасугавага асяроддзя рэгіёну [0].

Адной з мэт навучання асновам мастацтва дзяцей малодшага школьнага ўзросту ва ўстановах дадатковай з'яўляецца фарміраванне ў іх пазнавальнай актыўнасці, якая праяўляецца ў мастацкай накіраванасці і ўстойлівасці цікавасці, імкненні да авалодання ведамі, спосабамі і тэхналогіямі мастацкай дзейнасці, а навучанне асновам народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляецца менавіта той сферай практычнай дзейнасці, якая грунтуецца на вельмі шырокім дыяпазоне агульнанавуковых, мастацтвазнаўчых і мастацкіх ведаў. Гэта сведчыць аб наяўнасці цеснай ўзаемасувязі пазнавальнага і мастацкага інтарэсаў, – малодшы школьнік вучыцца і імкнецца спазнаць новае не дзеля саміх ведаў, а з мэтай іх прымянення ў арганізацыі сваёй мастацкай жыццядзейнасці. Паколькі дадатковая адукацыя адносіцца да сферы вольнага часу, важна разгледзіць прынцыпах яго арганізацыі, якія, на думку навукоўцаў, абумоўліваюць фарміраванне цікавасці ў малодшых школьнікаў: прынцып актыўнасці (прадугледжвае актыўныя дзейныя формы правядзення вольнага часу); прынцып прывабнасці; прынцып эмацыянальнай насычанасці; прынцып дыферэнцыраванага падыходу; прынцып гнуткасці і варыятыўнасці; прынцып зычлівасці і стварэнне спрыяльнай псіхалагічнай атмасферы падчас сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Так сама арганізатарам мастацкаарыентаванай сацыяльна-культурнай дзейнасці трэба памятаць пра тры важныя этапы ўспрымання мастацкага твора школьнікамі, на якія ўказвае Б.Ц. Ліхачоў [3**Ошибка! Источник ссылки не найден.**]:

1. Першаснае ўспрыманне, першаснае творчае аднаўленне ў свядомасці мастацкіх вобразаў. Сутнасць гэтага этапу заключаецца ў тым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што першаснае ўспрыманне дзецьмі мастацкага твору неабходна прадумваць. Ён заўважыў, што пры першасным неарганізаваным успрымання, дзеці, як правіла часта прапускаюць тое, што здалося незразумелым або нецікавым, што прайшло міма іх увагі з прычыны недахопу жыццёвага вопыту ці слабасці мастацка-эстэтычнага развіцця. Першаснае засваенне твору мастацтва прад'яўляе спецыфічныя патрабаванні да формаў арганізацыі ўспрымання, –найбольш эфектыўная першая сустрэча дзіцяці з творам мастацтва адбываецца ў форме вольных зносін. Педагог-арганізатар папярэдне зацікаўлівае дзяцей, паказвае, на што звярнуць асаблівую ўвагу і заахвочвае да самастойнай працы, навыкам і прыёмам якой дзяцей таксама вучаць. У розных формах сацыяльна-культурнай дзейнасці дзеці удзельнічаюць у калектыўным і па асобах чытаннях урыўкаў, праслухоўванні дыскаў з запісам мастацкага чытання, драматызацыі, калектыўных спевах, праглядах фільмаў, карцін, дыяпазітываў, сумесных паходам у кіно, праглядах і праслухоўваннях спектакляў, тэле-і радыёперадач.

На гэтым этапе Б.Т. Ліхачоў прапануе стымуляваць дзіцячае актыўнае ўспрыманне пасродкам цікавых сюжэтаў твораў, раскрыцця мастацкіх прыёмаў, якія выкарыстоўваюцца аўтарамі, адшуквання гістарычнага матэрыялу, якія характарызуе час, калі ствараўся твор. Выкананне даследчых заданняў па зборы фактаў, якія тычацца стварэння твора, абмеркаванне з дзецьмі спрэчных месцаў, незразумелых сітуацый і тэрмінаў – усе гэтыя прыёмы актывізуюць ўспрыманне, робяць яго больш глыбокім і поўным, спараджаюць ўстойліваю цікавасць, ствараюць рэальную аснову для далейшай працы над творам. У педагогіцы вольнага часу прапануецца прыцягваць і вопыт асабістых адносін дзіцяці праз творчыя заданні па параўнанні перажыванняў, якія ўзнікаюць у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўспрымання твора, з перажываннямі, псіхічнымі станамі, якія нараджаюцца ў жыццёвых сітуацыях.

2-гі этап заключаецца ў тым, што дзецям даюць магчымасць творчага прайгравання мастацкага твора або яго частак ва ўласнай дзейнасці, каб высветліць ці стаў твор мастацтва духоўным здабыткам дзіцяці, ці захоўваецца да яго інтарэс. Падчас заняткаў выяўленчым мастацтвам і музыкай ў якасці дадатковых заданняў Б.Т. Ліхачоў раіць выкарыстоўваць славеснае апісанне сюжэту, асноўнай ідэі, ацэнку кампазіцыі, сродкаў мастацкай выразнасці; у літаратурных і выяўленчых гуртках неабходна прадугледзіць творчыя заданні па падбору музычнага матэрыялу сугучнага асноўным ідэям твора, або візуальнаму вобразу; калі малодшыя школьнікі валодаюць выканальніцкімі навыкамі, яны могуць атрымаць заданне паімправізаваць на тую ці іншую тэму.

3 этап засваення твора мастацтва – этап «навуковага спасціжэння мастацкай дзейнасці», які немагчымы без тэарэтычнага мастацкага і навуковага аналізу. Пры гэтым разуменне дзецьмі твора мастацтва з дапамогай аналізу, на думку аўтара, можна арганізаваць наступным шляхам: каб школьнік зрабіў самастойную спробу тэарэтычнага асэнсавання мастацкай з'явы (падрыхтаваў рэцэнзію, даклад, выступіў у ходзе абмеркавання, склаў крытычны агляд, выявіў асноўную ідэю твора, апісаў сюжэтную лінію, паказаў асноўныя рысы герояў і даў ацэнку іх дзеянняў). Педагагічная карысць аналізу мастацкага твора складаюцца з таго, што дзеці знаёмяцца з шырокім колам пытанняў, ўсведамляюць, як шмат трэба працаваць, каб зразумець таямніцу твораў мастацтва. У іх развіваецца цікавасць і жаданне глыбокага творчага асваення мастацтва.

З усіх відаў мастацтваў выяўленчае мастацтва і дэкаратыўна-прыкладная творчасць, як падвід, найбольш даступныя для дзіцячай творчасці. У выяўленчай творчасці дзіця заўсёды выразна выказвае тое,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што яму падабаецца, ці не, тых, каму ён спачувае, ці каго асуджае. Вось чаму выкарыстоўваючы эмацыйныя і выразныя магчымасці выяўленчага мастацтва ў працэсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці, ёсць магчымасць фарміраваць і падтрымліваць мастацкі інтарэс дзіцяці.

Выхаванне дзяцей сродкамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў сістэме дадатковай адукацыі ўключае ў сябе не толькі практычныя заняткі па маляванню і лепцы, але і экскурсіі, гутаркі, удзел у выставах, дабрачынных мерапрыемствах у большым аб'ёме, чым у школьнай праграме. Арганізацыя экскурсійнай дзейнасці дапамагае далучэнню дзяцей да культурнай спадчыны сваёй Радзімы. У працэсе экскурсій дзеці знаёмяцца наглядна з гісторыяй і культурай народаў сваёй мясціны. Для больш пачуццёвага эмацыйнага ўспрымання, адзначае Я.М. Сахута малодшым школьнікам вельмі важна не толькі ўбачыць на малюнках, але і самім пабываць ў беларускай хатцы, на вытворчасці ў рамеснікаў [4]. Пасля правядзення экскурсіі карысна ў творчасці прапанаваць новую тэму, каб дзеці змаглі замацаваць сфарміраванае эмацыянальнае стаўленне па тэме экскурсіі, магчымасць прадставіць сябе ўдзельнікам падзей або ў ролі чалавека, працы якога апавядала экскурсія.

Творы з прыродных аднаўляльных матэрыялаў адкрываюць перад дзецьмі прыгажосць навакольнага свету, які яны павінны навучыцца любіць, пра які яны павінны клапаціцца і абараняць. Таму гутаркі, віктарыны і гульні пра дэкаратыўна-прыкладное мастацтва павінны замацоўвацца практычнымі заняткамі, для таго каб дзіця змагло прапусціць праз сябе «атрыманы» матэрыял. На думку І.І. Калачовай, калі падчас зносін з дзецьмі выкарыстоўваць гаворкі, народныя прымаўкі і прыказкі, яны зусім натуральна ўваходзяць у слоўнік дзяцей [2]. Пры знаёмстве з асновамі народнай культуры карысны формы сацыяльна-культурнай дзейнасці па тэматыцы прадметаў працы і побыту нашых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

продкаў, звычаяў і традыцый, свят беларускага народа, з выкарыстаннем твораў дзіцячага фальклору (прымаўкі, хуткамоўкі, загадкі, заклічкі, лічылкі, народныя гульні і г.д.). Бо не сакрэт, што менавіта ў іх, у творах народнай творчасці, галоўная выхаваўчая каштоўнасць, якая ўплывае на фармаванне маральных пачуццяў. Формы і спосабы падачы фальклорнай інфармацыі разнастайныя: гэта гутаркі, заняткі, удзел у абрадах, гульнях, карагодах, праслухоўванне народнай музыкі, выкананне народных песень і г.д. Найболей яркія – абрады, якія адлюстроўваюць побыт сялянскай вёскі і з'явы прыроды, звязаныя са зменай пор года, яны перадаюць працу людзей і адносіны дарослых і дзяцей, прадстаўлены ў народных святах. Вусная народная творчасць – выдатны матэрыял для мастацкагарыентаванага выхавання малодшых школьнікаў, а дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва – выдатны сродак для фармавання інтарэсу на мастацтва.

Такім чынам, паколькі фарміраванне цікавасці да мастацтва залежыць ад актыўнасці дзіцяці ў мастацкай творчасці, а яна ж у сваю чаргу непасрэдна ўплывае на саму актыўнасць, то асноўнай умовай і шляхам з‘яўляецца стварэнне і рэалізацыя спецыяльных праграм разнастайнай мастацкаарыентавай сацыяльна-культурнай дзейнасці малодшых школьнікаў.

---

1. Дополнительное образование детей и молодежи в 2016/2017 учебном году: актуальные содержательные и организационные аспекты: инструктивно-методическое письмо. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://edu.gov.by/page-6131. – Дата доступа 05.12.2016.

2. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапед. спадчына народаў Беларусі / І.І. Калачова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1999. – 179 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Лихачев, Б.Т. Философия воспитания : спец. курс / Б.Т. Лихачев. —. М. : Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2010. – 335 с.

4. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі / Уклад. Я.М. Сахута. – Мн. : Беларусь, 2001. – 168 с.

**Каптерова Д.В.,** студентка 115 гр.

Научный руководитель – Алекснина И. А.

## ОСНОВНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ СОВРЕМЕННОГО БЕЛОРУССКОГО ТЕАТРА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«У театра великая будущность, как у всего, что имело великое прошлое» – так говорил один из известнейших чешских писателей XX века Карел Чапек. Театр на территории Беларуси зародился еще в глубине веков из творчества народа, продолжал своё развитие в творчества бродячих музыкантов, трупп белорусских магнатов, деятельности любительских и профессиональных коллективов с конца XIX века и достиг расцвета своего развития именно в XX веке. На сегодняшний день в Беларуси насчитывается 28 государственных театров, которые известны не только в нашей стране, но и за её пределами. Сегодня активное развитие получили не только профессиональные театры, но и любительские коллективы.

XXI век – время поиска новых форм. Пожалуй, сегодня в театре можно увидеть всё что угодно, кроме классических постановок с традиционными декорациями, привычным глазу и уху, актерским самопиаром в ненавязчивой режиссуре. Иллюстративные спектакли давно вышли из моды. Волна поиска нового театрального языка уже прошла за рубежом и почти добралась до Беларуси.

Но не так просто сдвинуть годами формировавшийся репертуар театров страны. Драматические театры топчутся на месте. В это время за